# Як заўсёды заставацца ў курсе актуальных падзей?

#яанлайн

**1.** Праверце, ці ўключаны мабільны інтэрнэт: правядзіце пальцам ад верхняй часткі экрана да сярэдзіны і знайдзіце значок з дзвюма стрэлкамі ўверх-уніз..

**2.** Націсніце на значок «Play Маркет» ці AppStore. У праграме, якая адкрыецца, у радку «Пошук» увядзіце «Telegram Messenger» і націсніце кнопку «Усталяваць». Пасля націсніце кнопку «Адчыніць».

**3.** Націсніце на «Старт», увядзіце свой нумар тэлефона і далей націсніце кнопку «Атрымаць код па SMS». Увядзіце атрыманы набор лічбаў.

**4.** Ура! Вы ўвайшлі ў Telegram. У акне з запытам на адпраўку паведамленняў, што адчынілася, націсніце кнопку «Дазволіць». Так праграма будзе вас апавяшчаць пра новыя паведамленні.

**5.** Цяпер можаце падпісацца на каналы (суполкі па інтарэсах) з карыснымі ці актуальнымі артыкуламі: «ЯнОнлайн», Onliner і іншыя. Для гэтага ў радку «Пошук» напішыце назву выдання ці запыт, які вас цікавіць, напрыклад «навіны спорту» альбо «кіно і серыялы».

**6.** Прагледзьце вынікі пошуку і, калі інфармацыя на канале вас задавальняе, націсніце кнопку «Далучыцца».

**Калі патрэбна дапамога, патэлефануйце:**

________________ (імя)

+375 ________________ (тэл.)

Больш інструкцый на **ionline.A1.by**